**Маціеўскі, М**. На вайне і пасля яе / М. Маціеўскі // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1993. — 5 чэрв. — С. 2—3.

## НА ВАЙНЕ І ПАСЛЯ ЯЕ

*Афганістан. Афганцы. Інтэрнацыяналісты. Ацынкаваныя дамавіны. Слёзы, паламаныя лёсы жанчын і дзяўчат, што не дачакаліся любімых з далёкага краю. Усё гэта змітавалася ў адзін сувой, назва якому – трагедыя народа, трагедыя пакалення, абпаленага вайной, якой магло і не быць. Звыш 14400 загінуўшых і памёршых ад ран, звыш прапаўшых без вестак – такія ахвяры неаб'яўленай вайны, якая працягвалася дзевяць гадоў і пяцьдзесят адзін дзень.*

*Афганскі клубок даўно перастаў быць знешнепалітычнай праблемай. Кропля за кропляй, пралітая ў Афганістане кроў нашых дзяцей даўно ўцякае ў нашы вены, яна стала часцінкай нашай свядомасці, нашага сумлення.*

*Нават і зараз мы не ведаем усёй праўды пра гэтую вайну. Але, ідучы па вуліцы, мы час ад часу сустракаем маладых хлопцаў у інвалідных калясках, глядзім ім у вочы... і становіцца страшна. Гэтую вайну забыць нельга.*

Аб гэтым думаю кожны раз, калі праходзяць традыцыйныя раённыя злёты воінаў-афганцаў. Кожная такая сустрэча – адкрыццё. На выгляд і яны такія ж звычайныя, як і іх равеснікі – маладыя, дужыя, жыццярадасныя. І ў той жа час не па гадах сталыя, сур'ёзныя, разважлівыя. І амаль у кожнага – баявыя ўзнагароды. Яны зведалі жудасную вайну, яны даказалі, што дастойныя славы сваіх бацькоў. Народны дэпутат Рэспублікі Беларусь, старшыня райвыканкома Міхаіл Уладзіміравіч Васілеўскі сказаў на апошнім злёце афганцаў так:

– Усе мы ганарымся вамі. Большасць воінаў-інтэрнацыяналістаў праявілі сапраўдную мужнасць, гераізм, абараняючы братні народ. Ваша баявая слава пераважыве вякі.

**Час выбраў нас**

*Время выбрало нас,*
*Закружило в афганской метели*
*Нас позвали друзья в грозный час,*
*Мы особую форму одели.*
*И в огне горных, трудных дорог*
*Своей кровью кропили походы,*
*Не заметили в вихре тревог,*
*Как минуты прессуются в годы.*
*Верность, доблесть, отвага и честь –*
*Эти качества не напоказ,*
*У Отчизны героев не счесть,*
*Время выбрало нас...*

Нарадзіўся і вырас Станіслаў у вёсцы Рыжанкі, у вялікай сям'і. З шасцярых дзяцей быў старэйшым. З маленства прызвычаіўся да паўсядзённай сялянскай працы. Напэўна, і тады ён адрозніваўся ад равеснікаў сур'ёзнасцю ўчынкаў, сялянскай грунтоўнасцю. Добра вучыўся ў школе, СПТВ, потым працаваў механізатарам у родным саўгасе «Слідчаны». Захапляўся спортам, перад службай выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту па лёгкай атлетыцы.

У дзяцінстве Station Станіслаў любіў разглядаць ордэны і медалі дзеда Міхаіла. А сёння ў яго самога, зусім яшчэ маладога хлопца, ёсць ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», Знак ЦК ВЛКСМ «Воінская Доблесць».

Служыў у паветрана-дэсантных войсках, на самым цяжкім участку – у разведцы асобага прызначэння. Пасля трохмесячнай падрыхтоўкі ва ўмовах, набліжаных да баявых, навучыўся лёгка лазіць па гарах. Але горы Афганістана аказаліся больш складанымі за тыя, што былі на трэніроўцы. Грады вострых зубчастых скал тут чаргуюцца з глыбокімі чашамі зыбучага, як дрыгва, пяску. Сюды трэба дадаць пяцідзесяціградусную спёку, сцюдзёныя, да ламоты ў суставах, ночы.

Маладога салдата ўзяў пад сваю апеку намеснік камандзіра ўзвода старшына Аляксандр Берднік. Разам хадзілі ў дазоры, дзялілі кавалак хлеба, флягу вады. А калі Берднік звольніўся ў запас, яго месца заняў Станіслаў Кандратовіч.

Ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў на трэцім месяцы службы у Афганістане. Іх асобая разведрота атрымала баявое заданне – прачасаць хады-штольні ў скалах, якія цягнуцца на некалькі кіламетраў і звязваюць паміж сабой кішлакі. Імі карысталіся душманы. Станіслаў Кандратовіч ішоў разам з Андрэем Кічанавым з Краснаярска, свяцілі ліхтарыкамі. На перадзе пачулі галасы. «Духі» – зразумелі сябры. Яны ведалі, што ў штольні страляць небяспечна. Ад шуму могуць лопнуць барабанныя перапонкі, таму надзелі на ствалы аўтаматаў спецыяльныя насадкі для бясшумных стрэлаў.

Ім удалося стрэліць першымі. У глыбіні штольні заўважылі драўляныя дзверы. Асцярожна расчынілі іх, адхіліліся ў бакі. Нікога. Гараць газавыя лямпы, на падлозе – маленькія дываны для намаза, казаны з рэшткамі ежы. Насупраць яшчэ адны дзверы, гэта з-за іх і чуліся галасы.

– Паглядзім, – запытальна зірнуў на Кічанава Станіслаў.

– Давай, – вачамі адказаў той.

Дзверы аказаліся незамкнутымі. У глыбіні пакоя пяцёра пілі чай. Зброя ляжала побач.

Дзве асколачныя гранаты адначасова паляцелі ў логава душманаў. Выбраўшыся на паверхню, салдаты выклікалі падмогу. Яшчэ адзін склад «непрымірымых» перастаў існаваць.

Медаль «За баявыя заслугі» Станіслаў атрымаў за тое, што ў жорсткім баі замяніў параненага камандзіра – лейтэнанта Сямёнава, праявіў мужнасць, рашучасць і выдатныя камандзірскія здольнасці.

За мужнасць у аперацыі па захопу душманскага каравану са зброяй Станіслаў Кандратовіч і яго таварышы былі ўзнагароджаны медалямі «За адвагу».

Толькі тры дні вайны. А колькі іх было, небяспечных, жудасных, кровапралітных за год і дзевяць месяцаў афганскай біяграфіі Станіслава Кандратовіча.

– Скажы шчыра, Стась, ці было страшна ў баі?

– Часцей у баі проста некалі было думаць пра страх. Нам трэба дзейнічаць. А наогул вайна – гэта страшна. Даводзіцца забіваць.

– А ці была ў Афганістане «дзедаўшчына?» – задаў, на мой погляд, правакацыйнае пытанне.

Станіслаў, як заўсёды, адказаў вельмі сур’ёзна;

– Была. Але ў тых суровых умовах яна мела зусім іншы сэнс. І выратавала жыццё не аднаму салдату. Так, «дзяды» каралі сваіх нявопытных таварышаў за нядбайнасць, бяспечнасць,

за нежаданне пазнаваць суровую салдацкую навуку. Але рабілі гэта не зневажаючы чалавечую годнасць. Проста прымушалі маладых больш займацца фізічнай падрыхтоўкай. І адначасова зберагалі тых, хто першы раз ішоў у бой, цярпіма адносіліся да промахаў навічкоў.

...Сёння Станіслаў працягвае службу. Толькі ўжо ў міліцыі, стаіць на варце правапарадку. Салдат ёсць салдат!

Розныя траплялiся афганцы – разгаворлівыя і маўчуны, сапраўдныя волаты і непрыкметныя з выгляду. Але ўсе яны – хто сам, хто з маёй «падказкі» – прызнаваліся, што цяпер іх жыццё мае тры дакладна раздзеленыя паласы – да службы ў арміі, сама служба і пасля службы. Вядома, раздзелены яны сімвалічна, паколькі сувязі тут, калі ўдумацца, больш адчувальныя чым адрозненні. І ўсё ж... На раённым злёце ўпершыню пазнаёміўся з Аляксандрам Іўкіным з Ізгародзішча. Прывабны юнак, стройны, падцягнуты. У размове вельмі сціплы. Мо таму нават ордэн Чырвонай Зоркі не адзеў на пінжак. А зведаць яму давялося многае. Чалавек ён мужны, загартаваны ў баях. Не асароміў хлопец высокае званне савецкага салдата. І пры захопе нашымі воінамі склада з боепрыпасамі, дзе для душманаў было завезена звыш тысячы рэактыўных снарадаў. І тады, калі іх узвод за дзве гадзіны ўзяў у палон звыш дваццаці «духаў», і ў многіх іншых баявых сутычках Аляксандр Іўкін быў наперадзе. Больш чым у трыццаці баях прымаў ён удзел, не раз глядзеў смерці ў твар, быў паранены.

І ніколі не выкрасліць з памяці Аляксандра вогненныя дні і ночы службы ў Афганістане, не сцерці ў памяці твару загінуўшага таварыша, які толькі што, якую гадзіну назад, пісаў пісьмо каханай. А хіба можна забыць бяздонныя, поўныя болю вочы афганскага хлопчыка, які стаяў на парозе разбуранага душманамі дома! Дома, пад развалінамі якога пахаваны яго маці і сястра...

– І сёння часта сніцца Афганістан. Асабліва афганскія дзеці. Па руску ведалі хіба толькі «хлеб»і «спасибо». Мы заўсёды прыберагалі па лустачцы для чорнавокіх гаўрошаў. Ды што ім тыя лустачкі! Пасадзіць 6ы іх усіх за доўгі бацькоўскі стол, на якім і аладкі, і варэнне... Ім і цяпер не салодка прыходзіцца. Хоць і вывелі нашы войскі, а вайна не спынілася, стала яшчэ больш жорсткай, – разважае Аляксандр.

Часта аб узаемавыручцы, таварыскасці мы гаворым – і справядліва! – як аб якасцях асаблівых, вартасцях з вартасцей. Але часам жыццё ставіць людзей у такія ўмовы, калі ўзаемавыручка становіцца патрэбнай і абавязковай умовай. Менавіта так было ў Афганістане. «Прыкрыць спіну» таварыша, вынесці з-пад агню раненага, раздзяліць на дваіх апошні глыток вады. Армейская таварыскасць і пацвярджалася рускім салдатам.

– Дэвіз «Сам загінь, а таварыша выручай», гаворыць Аляксандр, – гэта для воінаў-інтэрнацыяналістаў быў не проста словамі, а жыццёвай неабходнасцю. Без гэтага ў баю немагчыма. Кожны з нас адчуваў у баю побач з сабой надзейнае плячо таварыша, сапраўднага мужчыны. Менавіта ў арміі я адчуў сябе мужчынам, пазнаў, што такое сяброўства.

Аляксандр задумаўся, замаўчаў на некалькі хвілін, а потым зноў загаварыў:

– Нам, сённяшнім удзельнікам злёту афганцаў, пашчасціла застацца ў жывых. А колькі выдатных хлопцаў палягло. Вы, журналісты, лепей пра іх расказваеце. увекавечце іх подзвіг. Мы ўсе ў даўгу перад імі.

І раптам Аляксандр здзівіў мяне. Адвёўшы ў бок вочы, нягучна задэкламаваў вершы афганскага аматара-паэта

*Приходят о гибели вести,*
*Из памяти их не стереть,*
*А знаешь, дружище, по чести*
*Нам надо бы братством, всем вместе,*
*Уйти в монастырь и скорбеть,*
*Молясь тем, кто пал за рекою.*
*А мы возвращаемся в мир,*
*Где дьявол кровавой рукою*
*Наш доблестный путь окропил.*

І праз тысячу гадоў гэты голас душы паэта будзе зразумелы, і скажа аб нашым часе больш, чым любы дакумент. Таму што і тады на зямлі, спадзяёмся, будуць жыць людзі. А гэтыя хлопцы – афганцы ведаюць шмат вершаў, песень пра сваю вайну.

На злёце яны спявалі, чыталі. Пад гітару, якая была неразлучнай сяброўкай у час прывалаў.

Але вернемся да памяці загінуўшых. Згодны з Аляксандрам – мы павінны ўвекавечыць подзвіг тых, хто не вярнуўся з афганскай вайны. Пра чацвярых загінуўшых нашых землякоў, цудоўных хлопцаў, аўтар гэтых радкоў, ужо расказваў на старонках раёнкі. Сёння мой расказ пра Юрыя Кузняцова, якому назаўсёды наканавана застацца дзевятнаццацігадовым.

**Толькі ён не вярнуўся з бою**

*Как сказать, кем бы в жизни он был?*
*Может быть, созидал бы и строил*
*Может быть, корабли бы водил,*
*Только он не вернулся из боя.*
*Дом родимый и мать у окна,*
*Может, снились ему перед боем,*
*И девчонка, что ходит одна,*
*Белорусское небо родное.*
*На афганской земле между скал*
*Эхо жаркого боя звучало.*
*Взрыв гранаты – Юра упал,*
*Его сердце стучать перестало.*
*Постарела без времени мать,*
*Пережить ей как горе такое?*
*Оставалось недолго ждать,*
*Только он не вернулся из боя.*

Смерць заўсёды жудасна несправядлівая. Быў чалавек – і няма, і ніколі больш не будзе. Змірыцца з гэтым немагчыма.

... Цынкавую дамавіну адкрываць не раілі. Усё ж такі ад Кабула да Новалукомля такая адлегласць. Затрымала нялётнае надвор'е. Маці падыйшла да труны, і з горыччу, са слязамі на вачах ледзь чутна прашаптала, нібы жывому:

– Што ж ты, Юра? Ты ж абяцаў...

Як няпроста вырасціць сына! Кароткія месяцы бездапаможнасці – і вось ён ужо зрабіў першы крок за парог. За ім друті, трэці… Расце чалавек – растуць трывогі. Спачатку маці баіцца, каб ён за што-небудзь не зачапіўся і не ўпаў, не разбіў нос. А далей... Тут многа небяспек. Выратаваць, абараніць, захавадь – гэта толькі малая доля ўсіх мацярынскіх трывог. Трэба вырасціць грамадзяніна. Ён павінен быць сумленным і працавітым, добрым і надзейным.

Маці Юрыя Кузняцова – Тамара Цімафееўна прысутнічала на злёце воінаў-афганцаў. Цяжка, ой як цяжка расказваць было ёй пра сына. Раз за разам выцірала змяклай хусцінкай набягаючыя слёзы:

– Юра рос без бацькі. Яму так хацелася хутчэй стаць дарослым і дапамагаць мне ва ўсім. Шмат працаваў на агародзе, самая цяжкая работа была за ім. Ён не дазваляў капаць рыдлёўкай ні мне, ні бабулі, якую таксама вельмі любіў, як і яна яго. Усю бульбачку перавязе дадому на веласіпедзе. Крывіначка мая. Ён любіў людзей, любіў жыццё, хацеў мець сям'ю, дзяцей. Вельмі крыўдаваў на мяне, што няма ў яго брата. Можа сэрца прадчувала, што застануся адна? Да арміі Юрый Кузняцоў закончыў ПТВ-83 па спецыяльнасці электразваршчык. А вераснёўскім днём 1982 года хлопца праводзілі на службу.

– Як прыслаў Юра першае пісьмо з Афганістана, дык і памеркла для нас сонца, – слёзы зноў туманяць вочы Тамары Цімафееўны, голас зрываецца, – а потым і зусім закацілася. Душой бяду чула. Спаць не магла. То стукне хто, то пакліча, здаецца. Сэрца маё да сыночка рвалася. Не даляцела. Не памагла. Не ўберагла. І цяпер спакою аніякага. Дні – як пад хмарамі. Ночы — не збыць. Кідаешся з боку на бок, прасціну ў вяроўку скруціш. Прысніся хоць, Юрачка, Бога малю. Ды не ўбачу ніколі выяўна. Усё як у паўзмроку. Каб я толькі магла, – галосіць маці, – я б прыкрыла яго сабою, напаіла б у гарачыню халоднай вадзічкай, памыла б яму запылены твар, першай бы ішла ў той бой...

А ён пісаў дамоў цёплыя, сардэчныя пісьмы. Супакойваў родных:

*« Служба мая ідзе добра. Вось нядаўна ездзілі ў зялёную зону. Крыху адпачнулі. Наеўся да адвалу персікаў, абрыкосаў, яблыкаў, аж страўнік прыхапіла. Аб калючкі крыху расцарапаў руку, забінтаваная, таму і почырк дрэнны.*

*Цалую. Беражыце сябе. Юра. 7.06.83 г».*

А тады ён быў паранены ў жорсткім баі з душманамі.

«*Добры дзень, дарагія мама і бабуля!*

*Ну што вы так хвалюецеся? Я сапраўды жывы і здаровы. Кормяць нас выдатна. І за чэкі, якія нам замест грошай выдаюць, можна што хочаш купіць. Націскаю на пячэнне. Хутка таўсцяком стану. Жадаю здароўя. Не хвалюйцеся. Я ж салдат!..»*

*Между нами расстояний мгла,*
*Реки и непройденные выси.*
*Тропка связи нашей пролегла*
*Строчками твоих сердечных писем.*
*Знаю я: с печалью обо мне*
*Ты встречаешь зиму или лето,*
*Ждёшь письмо от сына, ждешь ответа*
*И о нём тоскуешь в тишине.*
*Я приеду, мама, ты лишь верь...*

Радкі, радкі, напоўненыя любоўю і павагай да маці, родных і сяброў...

А яму часта даводзілася сядзець у засадах, выследжваць праклятых душманаў. Якое там пячэнне, там нават вады не хапала. Лізалі падэшвы камянёў, каб хоць крыху наталіць смагу. Хто не быў там, цяжка зразумець усё гэта. Шмат пакут вынеслі хлопцы, але не задрыжэлі у іх ногі, мужкна вынеслі ўсе выпрабаванні.

З вайсковай характарыстыкі гвардыі радавога Юрыя Кузняцова:

*«Ю. Кузняцова любілі таварышы. Ён быў чулы, уважлівы. смелы, вынослівы. Заўсёды прыходзіў на выручку. У баях мужны, адважны, знаходлівы.*

*Гвардыі лейтэнант Малагін».*

13 лістапада 1983 года ў саставе баявой групы Юрый Кузняцоў знаходзіўся ў засадзе. Вечарам з'явілася банда мяцежнікаў. Завязаўся цяжкі бой – не на жыццё, а на смерць.

Гвардыі радавы кулямётчык Кузняцоў вёў агонь з укрыцця, не адзін душман лёг пад яго трапнымі чэргамі. Праціўнік абстрэльваў савецкіх воінаў з супрацьтанкавых гранатамётаў. Адна з гранат разарвалася паблізу пазіцыі, якую займаў Юрый. Ён быў смяртэльна паранены...

Юрый Кузняцоў, Мікалай Камека, Аляксандр Валасач, Вячаслаў Краўцоў, Алег Дуброўскі, Сцяпан Млявы. Шэсць нашых землякоў, якія загінулі ў Афганістне. На могілкі пяці з іх удзельнікі злёту воінаў-інтэрнацыяналістаў усклалі жывыя кветкі. Капітан Сцяпан Пятровіч Млявы пахаваны на Паўночных могілках у Мінску. У Афганістане ён ажыццявіў 117 баявых вылетаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, і медалём «За бездакорную службу III ступені» У яго расце сын Андрэй, які жыве з маці, Галінай Мікалаеўнай у сталіцы нашай рэспублікі.

***Як гімн гучала на плёце песня:***
***Не для песен, не ради славы***
***Вы упали на горькие травы.***
***Словно нить порвалася тугая,***
***Журавлиная дрогнет стая,***
***И становится сердцу тесно –***
***Вы останетесь, парни, в песнях.***
***Вечная память Вам!***

**Быць помніку!**

У канцы злёту воіны-інтэрнацыяналісты абступілі народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь, старшыню райвыканкома Міхаіла Уладзіміравіча Васілеўскага. Больш за ўсіх гаварыў старшыня раённага савета воінаў-афганцаў Мікалай Завальны:

– Мы прынялі рашэнне пабудаваць помнік загінуўшым нашым сябрам. Ужо і сродкі, матэрыялы неабходныя збіраем.

– Вельмі добрае рашэнне, – горача падтрымаў Міхаіл Уладзіміравіч. – Райвыканком таксама знойдзе сродкі, абавязкова дапамогуць прадпрыемствы, гаспадаркі. Выберам самае пачэснае месца для помніка, закажам праект. Няхай жыве ў вяках памяць аб нашых слаўных земляках...

На многія пытанні былых воінаў адказаў народны дэпутат. Вялася зацікаўленая размова і аб іх сацыяльнай абароне, працаўладкаванні. У нялёгкі час мы жывём, але мясцовыя ўлады прымаюць усе магчымыя меры, каб максімальна задаволіць патрэбы афганцаў.

– Звяртайцеся, не саромейцеся, – падкрэсліў М. У. Васілеўскі. – Мае дзверы для вас заўсёды адчыненыя...

Час мяняецца. Мяняюцца на нашых вачах адносіны людзей і грамадства да ветэранаў афганскай вайны. Грамадства ўсё ж успомніла пра свой абавязак перад імі. Мы ўспомнілі аб міласэрнасці, і гэта вялікі крок наперад. Але гэта павінна быць толькі пачаткам. Гэта толькі малая частка доўту, у якім мы перад ветэранамі афганскай вайны. А там за доўгам міласэрнасці – доўг удзячнасці за тую вялікую справу, якую афганцы робяць для нас – яны будзяць наша сумленне.

**М. Мацієўскі.**